УДК 37.013.8:39:323.1:94(476)

# ЗМЕСТ І СУТНАСЦЬ ПАНЯЦЦЯЎ "НАРОДНАЯ ПЕДАГОГІКА" І "ЭТНАПЕДАГОГІКА" Ў КАНТЭКСЦЕ НАЦЫЯНАЛЬНА-ГІСТАРЫЧНАГА РАЗВІЦЦЯ БЕЛАРУСАЎ

**А.Л. Міхайлава, Г.Т. Юркевіч**
*Віцебск, ВДУ імя П.М. Машэрава*
(e-mail: elena-mikhaylova@rambler.ru)

Фундаментальнае даследаванне беларускай народнай педагогікі пачынаецца з 1993 года, менавіта ў гэты час была выдадзена кніга "Беларуская народная педагогіка", аўтарам якой з'яўляецца доктар педагагічных навук, прафесар Г.П. Арлова. Упершыню ў айчыннай педагагічнай навуцы Г.П. Арловай раскрываюцца сутнасць маральнага выхавання ў беларускай народнай педагогіцы, пераемная сувязь паміж народнай і навуковай педагогікай, што змешчана ў наступных выданнях: "Народная педагогіка як фактар развіцця тэорыі маральнага выхавання" (1996), "Этнапедагогіка: тэорыя маральнага выхавання" (2001), манаграфіі "Пераемнасць народнай і навуковай педагогікі ў развіцці тэорыі маральнага выхавання" (2000). Гісторыкам педагогікі С.В. Снапкоўскай аналізуецца стан развіцця народнай асветы і адукацыі ў перыяд к. XIX – п. XX ст.ст., вынікі даследавання прадстаўлены ў шэрагу артыкулаў, манаграфіях: "Ля вытокаў нацыянальнай педагогікі" (1995), "Адукацыйная палітыка і школа на Беларусі ў к. XIX – п. XX ст.ст." (1998), калектыўнай манаграфіі "Народная педагогіка беларусаў" (1996). Айчынны даследчык В.С.Болбас з'яўляецца аўтарам шэрагу навуковых артыкулаў, кніг "Этычная педагогіка беларусаў", "Этыка-педагагічная думка Беларусі (са старажытнасці да XVIII ст.)" (абедзве кнігі 2004 года выдання). Л.В. Ракавай даследаванню праблем традыцыйнага сямейнага выхавання беларусаў прысвечаны шэраг навуковых артыкулаў і кніга "Традыцыі сямейнага выхавання ў беларускай вёсцы" (2000). Магчымасці выкарыстання беларускіх народна-педагагічных традыцый у сучасным маральным выхаванні паказаны А.А. Грымацем (калектыўныя выданні: "Народная педагогіка беларусаў", "Беларуская народная педагогіка: тэорыя і практыка"). В.У. Буткевіч і Ю.С. Любімавай выдадзена манаграфія "Эстэтычнае выхаванне малодшых школьнікаў сродкамі народнага дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва" (2008), а таксама складзены метадычны дапаможнік для настаўнікаў пачатковай школы "Народнае дэкаратыўна-прыкладное мастацтва ў пачатковых класах: вучэбна-метадычны дапаможнік" (2005).

Вышэйзгаданыя айчынныя навукоўцы ў пэўным накірунку распрацоўвалі пытанні тэарэтыка-метадалагічнага падыходу да вывучэння беларускай народнай педагогікі (аспектаў маральнага, фізічнага, сямейнага выхавання; фенамену маральнага і фізічнага ідэалу беларускага народа, тэарэтычнага вывучэння фальклору беларусаў). У той жа час паняційна-тэрміналагічны апарат даследавання праблем народнай педагогікі вымушае звярнуцца да вызначэння сутнасці і зместу паняццяў "народная педагогіка" і "этнапедагогіка" ў кантэксце нацыянальна-гістарычнага развіцця беларусаў.

Так, мэтай артыкула з'яўляецца вызначэнне зместава-сутнасных характарыстык ключавых паняццяў метадалогіі этнапедагогікі ў кантэксце айчынных даследаванняў.

Матэрыял і метады. Матэрыялам з'яўляюцца педагагічныя, этнапедагагічныя, гістарычныя навуковыя працы і артыкулы, а таксама працы па беларускай народнай педагогіцы (у тым ліку даследчыкаў народнай педагогікі Г.П. Арловай, С.В. Снапкоўскай; айчынных гісторыкаў В.К. Бандарчыка, С.Ф. Дубянецкага; беларускіх культуролагаў У.М. Конана, А.С. Майхровіча) у межах акрэсленай праблематыкі.



Рэпазіторый ВДУ

Метады даследавання: аналіз навуковых прац; параўнальна-супастаўляльны; метады аналогіі, канкрэтызацыі і абагульнення.

**Вынікі і іх абмеркаванне.** Для ўдакладнення праблематыкі даследавання лічым неабходным вызначыць гісторыка-метадалагічны падыход да паняцця "народная педагогіка", пачынаючы з першай спробы вызначэння навуковай сутнасці паняцця "народная педагогіка".

Адным з першых, хто акрэсліў у сваім даследаванні "Народная педагогіка", выдадзеным у Іркуцку ў 1926 годзе, сутнасць паняцця "народная педагогіка", быў рускі даследчык Г.С. Вінаградаў. Ён разумеў дадзенае паняцце як "сукупнасць і ўзаемадзеянне народных уяўленняў, поглядаў на жыццё, на выхаванне і навучанне новых пакаленняў, мэты і задачы выхавання і навучання іх, сродкі і шляхі ўздзеяння на новыя пакаленні" [2, с.7]. Г.С. Вінаградаў прадставіў народную педагогіку як адзінства педагагічных уяўленняў і ведаў народа з яго педагагічна-выхаваўчай практыкай.

У дадзеным накірунку працаваў І.Я. Паздзееў, дзякуючы навуковым намаганням якога ў 1929 годзе выйшла з друку падобная праца па народнай педагогіцы "Народная педагогіка удмуртаў". Народную педагогіку аўтар трактуе як "традыцыйную педагагічную думку і традыцыйнае выхаванне пэўнай этнічнай супольнасці" [7, с. 68].

Я.І. Ханбікаў у "Педагагічнай энцыклапедыі"прапануе разглядаць народную педагогіку як "сферу эмпірычных педагагічных ведаў і вопыту народных мас" [9, с. 12], г.зн. у сукупнасці педагагічных ідэй і выхаваўчай практыкі.

Большасць сучасных даследчыкаў народнай педагогікі характарызуюць народную педагогіку як сукупнасць і ўзаемазалежнасць ідэй, поглядаў, меркаванняў, перакананняў, а таксама выхаваўчых уменняў і навыкаў па праблеме выхавання дзяцей, адлюстраваных у народнай творчасці.

А.Л. Хрыстава вызначае паняцце "народная педагогіка" на некалькіх узроўнях:

1) як духоўны феномен, што ўласцівы свядомасці народных мас (эмпірычныя веды, звесткі, ідэалы, ідэі, погляды, уяўленні, устаноўкі выхавання і г.д.);
2) як педагагічную практыку розных народаў;
3) як адзінства педагагічнай думкі і педагагічнай дзейнасці народных мас;
4) як навуку аб народным выхаванні [10, с.103].

Дадзенае вызначэнне дазваляе паказаць цесную ўзаемасувязь педагагічнай думкі народа з практычнымі аспектамі выхавання.

У трактоўцы паняцця "народная педагогіка" неабходна пазбягаць атаясамлівання яе з паняццем "этнапедагогіка", на першы погляд, роднасным. Зыходзячы з вызначэння паняцця "этнапедагогіка" як "спецыяльнай галіны педагагічнай навукі, асноўным аб'ектам вывучэння якой з'яўляецца народная педагогіка" [3, с.7], упершыню прапанаванага ў 1974 годзе і вызначанага як навука расійскім даследчыкам Г.Н. Волкавым у працы "Этнапедагогіка", гэтага магчыма пазбегнуць.

Адна з нешматлікіх спроб развядзення дадзеных паняццяў належыць расійскаму даследчыку Г.А. Камаровай, якая спрабуе даць вызначэнне "этнапедагогікі як навукі, што раскрывае заканамернасці працэса сацыялізацыі асобы, і акцэнтуе сваю ўвагу на этнічнай спецыфіцы гэтага працэса ў розных грамадствах і культурах" [5, с. 212]. Пад "народнай педагогікай", згодна з даследчыцкай пазіцыяй вучонага, неабходна "разумець навуку аб народным выхаванні маладога пакалення" [5, с. 212]. Аўтар імкнецца падкрэсліць паняцце "этнапедагогіка" як больш шырокае, што вывучае ўсю "сістэму сацыялізацыі" асобы, у параўнанні з паняццем "народная педагогіка" – пэўнай састаўной часткай дадзенай сістэмы.

Вышэйзгаданыя даследчыкі зрабілі спробы навуковага вылучэння і ўдакладнення дадзеных паняццяў у глабальным іх вызначэнні, нас жа цікавіць праблема іх разумення ў межах аднаго народа – беларускага. На наш погляд, асаблівасці нацыянальна-

Рэпазіторый ВДУ

гістарычнага развіцця Беларусі паўплывалі на вызначэнне свайго, спецыфічнага, больш вузкага, але і больш справядлівага для беларусаў разумення паняццяў “народная педагогіка” і “этнапедагогіка”.

Даследчык гісторыі развіцця педагагічнай думкі Беларусі С.В. Снапкоўская зазначае, што народная педагогіка беларусаў як арганічная састаўная частка беларускай педагагічнай культуры “адлюстравала складаны і супярэчлівы працэс фарміравання беларускай нацыі, стала яскравай сведкай росту духоўнай культуры народа” [8, с. 129].

Айчынны даследчык беларускай народнай педагогікі Г.П. Арлова вызначае “народную педагогіку” як “сукупнасць і ўзаемазалежнасць уяўленняў, поглядаў, меркаванняў, перакананняў, ідэй, навыкаў і прыёмаў у галіне выхавання, адлюстраваных у народнай творчасці” [1, с.7].

У.М. Конан – беларускі філосаф, даследчык этнічнай культуры і фальклору беларусаў пры даследаванні ўзаемасувязі паняццяў “этнапедагогіка” і “этнічная культура”, вызначае, што яны “ахопліваюць лад жыцця этнасу на пэўных гістарычных этапах, аўтэнтычную народную творчасць, што выявілася ў міфалогіі, абрадах, фальклоры” [4, с. 7]. Даследчык сцвярджае, што ў працэсе шматвяковага развіцця адбывалася “селекцыя найлепшых узораў народнай культуры, якія набывалі сэнс ідэалаў людской жыццядзейнасці і паводзінаў у грамадстве” [4, с. 8–9], што ў сваю чаргу забяспечыла ўсёй класічнай этнічнай культуры, зафіксаванай у XIX – XX ст.ст. статус эфектыўнага сродку выхаваўчай і навучальнай дзейнасці. Ён робіць акцэнт на гістарызме этнічнай культуры і яе інтэгральнай часткі – народнай педагогікі, бо “народная культура не паддаецца прынятай у культуралогіі, літаратуразнаўстве і іншых галінах гуманітарнай навукі атрыбутацыі … і храналагічнай перыядызацыі” [4, с. 9].

Значыць, на думку У.М. Конана, які сцвярджае ў этнакультурным даследаванні, што асэнсаванне каштоўнасцей народнай педагогікі як “цэласнай сістэмы выхавання пачалося ў канцы XIX стагоддзя і цесна звязана з беларускім нацыянальным адраджэннем” [4, с. 6], этнічная педагогіка стала народнай педагогікай пры сістэматызаваным вывучэнні і фіксацыі адзінак этнічнай культуры.

Для вызначэння справядлівасці дадзеных меркаванняў лічым неабходным звярнуцца да аналізу сутнасці паняццяў “нацыя” і “народнасць” у нацыянальна-гістарычным праламленні.

Сучасны беларускі філосаф А.С. Майхровіч адзначае, што працэс фарміравання беларускай нацыі адбываўся на працягу XIX стагоддзя – эпохі “нацыянальнага Адраджэння, станаўлення і развіцця новай беларускай культуры” [6, с. 652].

Сучасныя айчынныя даследчыкі гісторыі развіцця беларускага народа: В.К. Бандарчык, С.Ф. Дубянецкі – паказваюць сутнасць паняццяў “народнасць” і “нацыя”, а таксама вызначаюць гістарычныя межы фарміравання беларускай народнасці і нацыі. В.К. Бандарчык трактуе “народнасць” як “моўную, тэрытарыяльную, эканамічную і культурную супольнасць людзей пераважна рабаўладальніцкай і феадальнай эпох” [11, с. 283]. Так, працэс фарміравання беларускай народнасці, згодна з даследчыцкай пазіцыяй аўтара паняцця, пачаўся ў канцы XIII – XIV ст. (быў звязаны з росквітам Вялікага княства Літоўскага ў плане “ўзмацнення інтэграцыйных працэсаў, развіцця феадальных адносін, панавання адзінай старажытна-беларускай мовы і культуры, развіцця гаспадарча-эканамічных адносін” [11, с. 283]) і завяршыўся ў XV–XVI ст. па прычыне акаталічвання і паланізацыі вярхоў і значнай часткі сярэдніх саслоўяў, што звязана з аб’яднаннем ВКЛ і Каралеўства Польскага, затым па прычыне русіфікацыі, звязанай з далучэннем гістарычнай тэрыторыі Беларусі да Расійскай Імперыі – такім чынам, XVII – першая палова XIX стагоддзяў былі неспрыяльнымі для далейшага развіцця беларускай народнасці.

Репозиторий ВГУ

Даследчык С.Ф. Дубянецкі вызначае ўмовы развіцця капіталістычных адносін і патрэбу ў шырокай адукацыі народных мас у Беларусі, якія маюць месца з другой паловы XIX стагоддзя, як спрыяльныя для ператварэння беларускай народнасці ў "нацыю" – "устойлівую этнасацыяльную супольнасць людзей, якія пражываюць на адзінай тэрыторыі, звязаны агульным эканамічным і сацыяльна-палітычным жыццём, маюць адзіную культуру, мову і самасвядомасць" [11, с. 303].

Беларуская нацыя сфарміравалася, згодна з даследаваннямі айчынных гісторыкаў С.Ф. Дубянецкага і А.С. Майхровіча, у другой палове XIX – пачатку XX стагоддзя на аснове этнічнай і нацыянальнай супольнасці, характэрнай для яе папярэдняй феадальнай эпохі. Значыць, улічваючы нацыянальна-гістарычнае развіццё беларусаў як народнасці, што папярэднічала вызначанаму перыяду, справядліва гаварыць аб асобных арыгінальных традыцыях выхавання падрастаючага пакалення, заснаваных на асаблівасцях культуры кожнай з этнічных груп, што пражывалі на гістарычнай тэрыторыі Беларусі.

**Заключэнне.** Такім чынам, пры вылучэнні навукова-метадалагічнага падыходу да размежавання паняццяў "народная педагогіка" і "этнапедагогіка", зыходзячы з нацыянальна-гістарычнага кантэксту, справядліва, па нашым меркаванні, вызначаць здабыткі выхаваўчай спадчыны і этнічнай культуры беларускай народнасці, што пражывала на гістарычнай тэрыторыі Беларусі ў перыяд з XIII да XIX стагоддзя, як этнічную педагогіку, пад якой мы разумеем выхаваўчыя традыцыі асобнай этнічнай групы, што складваліся ў перыяд яе станаўлення. Пачынаючы з другой паловы XIX стагоддзя (гістарычнага пачатку фарміравання беларусаў як народа, як нацыі) народную педагагічную спадчыну неабходна іменаваць беларускай народнай педагогікай. Дадзенае паняцце, зыходзячы з уласных даследчыцкіх пазіцый, ёсць бесперапынны працэс стварэння, удасканалення і перадачы ў спадчыну педагагічных ідэй і выхаваўчай практыкі беларускага народа, занатаваных у яго народнай творчасці.

Спіс выкарыстаных крыніц:


1. Арлова, Г. П. Беларуская народная педагогіка / Г. П. Арлова. – Мн., 1993. – 94 с.
2. Виноградов, Г. С. Народная педагогика (отрывки и наброски) / Г. С. Виноградов. – Иркутск : Изд-е Вост.-Сибир. отдела русск. геогр. общества, 1926. – 30 с.
3. Волков, Г. Н. Этнопедагогика : Учеб. пособие для студ. сред. и высш. пед. учеб. заведений / Г. Н. Волков. – М. : Издательский центр «Академия», 1999. – 168 с.
4. Конан, У. М. Ля вытокаў самапазнання : станаўленне духоўных каштоўнасцей у святле фальклору / У. М. Конан. – Мн. : "Маст. літаратура", 1989. – 238 с.
5. Комарова, Г. А. О понятии "этнопедагогика" в советской этнографической и педагогической науке / Г. А. Комарова // Изучение преемственности этнокультурных явлений. – М. : Просвещение, 1980. – С. 202-212.
6. Майхровіч, А. С. Ля вытокаў нацыянальнага адраджэння / А. С. Майхровіч // Мысліцелі і асветнікі Беларусі. X – XIX ст.ст. Энцыкл. даведнік / Гал. рэд. Б.І. Сачанка. – Мн. : БелЭн, 1995. – 671 с. – С.647-654.
7. Поздеев, И. Я. Народная педагогика удмуртов / И. Я. Поздеев // Просвещение в Восточной области. – Ижевск, 1929. – Вып. 1. – 14-5 (X). – С. 67-77.
8. Снапкоўская, С. В. Адукацыйная палітыка і школа на Беларусі ў канцы XIX– пачатку XX ст.ст. / С. В. Снапкоўская. – Мн. : НІА, 1998. – 192 с.
9. Ханбиков, Я. И. Народная педагогика / Я. И. Ханбиков // Педагогическая энциклопедия. – М. : СЭ, 1966. – Т.3. – С. 35-36.
10. Христова, Е. Л. Об уточнении понятийного аппарата этнопедагогики / Е. Л. Христова // Сов. педагогика. – 1989. – №7. – С.103-106.
11. Энцыклапедыя гісторыі Беларусі. У 6 т. Т.5. М – Пуд / Г. П. Пашкоў (гал. рэд.) і інш. – Мн. : БелЭн, 1999. – 594 с. – С.303-305.


Репозиторий ВГУ